УДК 316.77:008

***Крывалап Аляксей***
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў,*
*Мінск, Беларусь*

# СУЧАСНАСЦЬ ЯК ПЕРСПЕКТЫЎНАЯ СФЕРА КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

Артыкул прысвечаны разгляду магчымасцей даследаванняў феномена сучаснасці ў межах культуралогіі. Асабліва ў тых выпадках, калі неабходна акрэсліць розніцу ў падыходах да сучаснасці іншых сацыяльна-гуманітарных дысцыплін. Разглядаюцца канцэпцыі сучаснасці, якія былі прапанаваны ў на мяжы XX і XXI ст. (З. Бауман і Э. Гідэнс). Артыкул не спрабуе вырашыць усе пытанні звязаныя з праблемай сучаснасці, а хутчэй з'яўляецца разгорнутымі ўводзінамі ў разуменне праблемы сучаснасці ў сферы культуры.

***Ключавыя словы: сучаснасць, мадэрнізацыя, культуралогія, медыя, практыка.***

Традыцыйна культуралогія цікавіцца акалічнасцямі культурнага жыцця даўно мінулых часоў. Па сутнасці тое як арганізавана і структуравана сістэма культуралагічных ведаў толькі падкрэслівае гэту арыентацыю ў мінулае. Зразумела, што частка гісторыі культуры з'яўляецца неабходнай для разумення формаў і дынамі развіцця грамадства. Аднак, чаму адносна XX ст. не ўзнікае такой колькасці тэкстаў, даследаванняў, нейкіх праектаў, якія магчыма знайсці адносна залатога веку ці пэўных класічных перыядаў? Магчыма, адказам на гэта пытанне можа быць не зусім выразна акрэслены статус сучаснасці як праблемы для культуралагічных даследаванняў.

У той час, калі іншыя сацыяльна-гуманітарныя дысцыпліны актыўна спрабавалі і спрабуюць зразумець трансфармацыі якія адбываюцца вакол канцэпцыі сучаснасці, культуралогія як бы не заўважае нават яе наяўнасці. Калі для філасофіі пытанне часу і месца з'яўляецца адной з вызначальных кропак адліку развіцця філасофскай думкі. Калі для сацыялогіі ў шырокім сэнсе і сацыялогіі культуры ў прыватнасці, сучаснасць фіксуецца досыць шырока: як розніца ў думках і практыцы прадстаўнікоў розных генерацый, так і як варыянт мадэрнізацыі грамадства, перабудовы яго ўнутранай структуры і пераасэнсаванне дэлегавання функцый і сфер адказнасці. Калі для псіхалогіі праблема

сучаснасці таксама знаходзіць шмат вымярэнняў, як на індывідуальным узроўні, так як калектыўныя дзейнасць. Калі для эканомікі праблемы сучаснасці відавочна канвертуюцца ў пытанне інавацый і новых тэхналогій вытворчасці і спажывання, без разумення непазбежных сацыяльна-культурных трансфармацый. То для культуралогіі сучаснасць не з'яўляецца вельмі актуальнай даследчай праблемай. Ёсць разуменне культуры і цывілізацыі, ёсць разуменне пагрозы мадэрнізацыі, дакладней яе першай хвалі, калі пад сцягамі Асветніцтва еўрапейская культура незваротна пераходзіла да новага тэхналагічнага ўкладу. Таго, што можа ўспрымацца як пераход ад аграрнай ці традыцыйнай сістэмы арганізацыі грамадства і культурнага жыцця да індустрыяльнай сістэмы. Гэта новая сітуацыя мадэрну канца XIX – пачатку XX ст. істотна адбілася на разуменні магчымасцей для развіцця культуры. У самым спрошчаным выглядзе гэта можа заўважыць на ўзроўні крытыкі з'яўлення масавай культуры і дамінавання густу і патрабаванняў сярэдне статыстычнага спажыўца культурных прадуктаў у выніку паўстання мас.

Сацыяльна крытычная тэорыя апісала і канцэптуалізавала і наступную хвалю трансфармацыі грамадства, якая мае шмат назваў з прыстаўкай пост: постмадэрнізм, постіндустрыяльнае грамадства і інш. І сёння ў пачатку XXI ст. калі чалавецтва знаходзіцца на парозе магчымага пераходу да наступнага сацыяльнага ўкладу, які цягне за сабой пагрозы робатызацыі і аўтаматызацыі, культуралогія быццам бы не заўважае ўсяго таго, што напрацавана ў XX ст. прадстаўнікамі іншых сацыяльна-гуманітарных дысцыплін і працягвае даследаваць праблемы існавання культуры з вялікай літары. Сапраўднасць і каштоўнасць якой правераны часам.

Зразумела, што адзін артыкул не можа радыкальным чынам трансфармаваць цэлую даследчую галіну, але можа паспрабаваць акрэсліць магчымыя кірункі для трансфармацыі. Такім чынам, мэта дадзенага тэксту апісаць сучаснасць як сферу, якая можа быць даследавана ў межах культуралогіі. Паказаць якім чынам праявы культуры непазбежна суадносяцца з нашымі ўяўленнямі пра сучаснасць і чаму традыцыйныя падыходы, якія выкарыстоўваць супрацьпастаўленне элітарнай і масай культуры не адлюстроўваць увесь спектр магчымых адметнасцей і трансфармацыі культурнай сферы. Паспрабуем з гэтым разабрацца.

Сучаснасць у спрошчаным выглядзе ўспрымаецца як адзін са шматлікіх рэкламных слоганаў, як наяўнае патрабаванне часу. Але што значыць быць сучасным? Грамадства спажыванне адказвае на гэта пытанне адносна проста, праз спажыванне маркёраў сучаснасці.

Валоданне сучаснымі рэчамі робіць чалавека сучасным, што прадугледжвае перманентнае спажыванне. Але ж адказ на гэтае пытанне істотна ўскладняецца, калі замест індывідуальнай практыкі валодання паказчыкамі сучаснасці, мы пераходзім на калектыўны ці сацыяльны узровень. Іншымі словамі, што значыць быць сучаснай культурай? Калі памылкова падмяняць атаясамліваць культуру з мастацтвам, то пытанне зробіцца толькі яшчэ больш заблытаным. Таму паспрабуем разабрацца выключна са сферай культуры.

Адным з вынікаў XX ст. стала відавочная залежнасць грамадства ад разнастайных тэхналогій. Калі да гэтага яшчэ магчыма было спрачацца адносна абмежаваных магчымасцей тэхналагічнага дэтэрмінізму і яго ўплывы на сацыяльнае жыццё, то зараз выкарыстанне пэўных тэхналогій з'яўляецца атрыбутыўнымі характарыстыкамі грамадскага жыцця. Нават не патрэбна далёка шукаць прыклады. Самае відавочнае – гэта залежнасць інфармацыйнага грамадства ад электрычнасці як тэхналогіі. Яшчэ не мінула і стагоддзе, як Савецкі саюз імкнуўся рэалізаваць план па электрыфікацыі ўсёй краіны, а ўжо зразумела, што без электрычнасці сённяшняя грамадства не зможа існаваць. Гарады з'яўляюцца не прыдатнымі для жыцця, калі ў іх адсутнічае электрычнасць. Гэта толькі адна з ключавых тэхналогій, але ёсць і іншыя, напрыклад гэта сфера камунікацыі. Якая таксама залежыць ад электрычнасці, але пры гэтым менавіта наяўнасць тых ці іншых тэхналогій з'яўляецца паказчыкам развіцця грамадства і культуры. У свой час такімі ключавымі тэхналогіямі, якія падкрэслівалі ўзровень развіцця культуры былі пісьменнасць, кнігадрукаванне, тэлефон, радыё, тэлебачанне. Адносна кожнай названай тэхналогіі выпрацоўваліся адпаведныя культурныя формы спажывання і ўзаемадзеяння. Так культуры ў якіх адсутнічала пісьменнасць, якія засталіся на ўзроўні вербальных форм камунікацыі, з пункту гледжання культурная антрапалогіі разглядаюцца як прымітыўныя. Вынаходніцтва тэхналогіі кнігадрукавання адкрыла галактыку Гутэнберга і зрабіла магчымым пераход да культуры тэксту. Калі напісанае атрымоўвае дадатковую значнасць і асаблівы статус у культурнай прасторы. Тэлеграф і тэлефон – былі першым крокам у пераадоленне праблемы часу і месца, радыкальным чынам дазволіла перагледзець культурныя межы і практыкі ўзаемадзеяння ў грамадстве. Радыё і тэлебачанне спрычыніліся да ўтварэння глабальнай інфармацыйнай прасторы, якая напачатку ўспрымалася як глабальная вёска. Завяршэннем гэтай камунікацыйнай гонкі стала распаўсюджванне інтэрнэту і як вынік насцярожанае чаканне інтэрнэту рэчаў і штучнага інтэлекту. Калі будзе немагчыма зразумець з кім мы ўзаемадзейнічаем па той

бок экрану: чалавекам ці робатам альбо алгарытмам. У свой час выкарыстанне кожнай з гэтых тэхналогій камунікацыі было звыш новым і магло быць паказчыкам таго, што вось яно будучыня, якая наступіла ўжо сёння.

Тут мы падыходзім да аднаго з распаўсюджаных у масавай культуры міфаў адносна сучаснасці. Калі сутнасць сучаснасці можа быць схоплена праз набліжэнне будучыні. Сучасным успрымаецца нешта, што мае сувязь з нашымі праектамі ці ўяўленнямі адносна будучыні. Зразумела, што гэта вельмі спрошчана тлумачыць ідэю прагрэсу развіццё якога імкнецца падмяніць сабой развіццё культуры. Гэты падыход быў шырока распаўсюджаны ў пачатку XX ст. на хвалі агульнай крытыкі мадэрнізацыі. Тут вельмі паказальна, што культуралогія быццам бы спынілася на гэтым разуменні феномена сучаснасці ў пачатку XX ст. Шмат з таго, што было напісана пазней у XX ст. так ці інакш было рэакцыяй на дамінаванне масавай культуры, якая ўвесь час прыспешвае нас рабіць выбар, спажываць і проста жыць.

Калі ў сферы сацыяльна-гуманітарных дысцыплін у любым кантэксце прыгадваюцца пытанні сучаснасці, то не магчыма пакінуць па-за ўвагай тэксты З. Баўмана і Э. Гіддэнса. Цікава, што гэтыя тэксты былі напісаны на англійскай мове ў 80-90-х гг. XX ст., потым з 20 гадовым спазненнем былі перакладзены на расійскую мову, але пры гэтым застаюцца адносна невядомымі для беларускай культуралогіі. Безумоўна, гэта магчыма патлумачыць сацыялагічным «паходжаннем» аўтараў, якія не факусуецца на культуралагічных пытаннях. Аднак, сёння не прадстаўляецца магчымым зразумець і патлумачыць працэсы арганізацыі і развіцця культуры, без гэтых канцэпцый.

Як адзначае З. Баўман: «Культура, якая змагаецца з прамаруджаннем, - навінка ў сучаснай гісторыі. У ёй няма месца для пераадолення адлегласцей, абдумвання, паслядоўнасці, традыцыі…» [1, с.172-173]. У сваім праграмным тэксце Liquid Modernity ён спрабуе патлумачыць трансфармаваўшыся ў XX ст. статус сучаснасці, якая згубіла цвёрдыя і непахісныя формы і як вадкасць прымае форму, якая залежыць ад лакальных практык. Былыя формы сацыяльнага жыцця быццам бы расплавіліся ў плавільным катле сучаснасці і гэтай вадкай пластычнай масе магчыма надаць розныя формы.

Адным з наступстваў вадкай сучаснасці для культуры З. Баўман лічыць утварэнне гардэробных супольнасцей, замест трывалых сацыяльна-культурных сувязей. Па аналогіі з тым, як наведвальнікі тэатру аб'ядноўваюцца толькі па адным крытэрыі і зацікаўлены ў спектаклю, а ўсе астатнія адрозненні і інтарэсы яны пакідаюць у гардэробе. Каб пасля таго, як спектакль завершыцца, вярнуцца да

сваіх штодзённых спраў. І тут узнікае пытанне, чым з'яўляецца культура ў гэтым выпадку: тым што аб'ядноўвае ці падзяляе грамадства? У якасці адказу варта прывесці словы З. Баўмана: «Адна з мэтаў гардэробных супольнасцяў палягае ў тым, каб эфектыўна прадухіляць кандэнсацыю «сапраўдных» (гэта значыць паўнавартасных і доўгачасовых) супольнасцяў, якія яны імітуюць і (зманліва) абяцаюць аднавіць ці спарадзіць на пустым месцы. Яны рассейваюць, а не збіраюць разам нявыкарыстаную энергію сацыяльных падахвочванняў і таму робяць ўнёсак ва ўвекавечанне самотнасці людзей, адчайна, але беспаспяхова шукаюць кампенсацыі ў рэдкіх ўзгодненых і гарманічных калектыўных справах» [1, с.216].

З іншага ракурсу да гэтага пытання падыходзіць Э. Гіддэнс, які выкарыстоўвае язду на калясніцы як метафару сучаснасці. Калясніца атрымоўвае стабільнасць толькі пад час руху, што тлумачыцца дынамічнай, а не статычнай раўнавагай. Але пры гэтым калясніца застаецца дастаткова небяспечнай. І ў гэтым сэнсе рэалізацыя праекту Асветніцтва істотна адрозніваецца ад тэорыі і першапачатковых планаў. Гэты розніцу Э. Гіддэнс тлумачыць на некалькіх узроўнях.

Першы, памылкі праектавання, калі «сучаснасць неаддзельна ад абстрактных сістэм, якія прадугледжваюць вызваленне сацыяльных адносін па ўсім дыяпазоне прасторы і часу, ахопліваючы як абагульненую прыроду, так і сацыяльны свет» [2, с.294].

Другі, памылкі аператару ці той самы чалавечы фактар. Калі любая, нават ідэальна спраектаваная калясніца можа разбіцца, калі кіроўца памыліцца пад час руху: «І ў адрозненні ад памылак праектавання, памылкі сацыяльныя ўяўляюцца невыпраўнымі» [2, с.295].

Але што гэта значыць для сучаснасці? Ва ўмовах сучаснасці сацыяльна-культурнае вымярэнне рэчаіснасці не будзе здольным сфармуляваць стабільнае і прадказальнае атачэнне, выкарыстоўваючы новыя веды і метады іх атрымання. Даследаванні ў сацыяльнай сферы не проста апісваюць грамадства, але адначасова  і спрыяюць яго пераўтварэнням і трансфармацыям. На думку Э. Гідэнса: «Гэта фундаментальная ўласцівасць сучаснасці як калясніцы; яна ўздзейнічае на сацыяльную прыроду ў той жа меры, што і самі сацыяльныя інстытуты» [2, с.297]. Іншымі словамі, даследаванні культуры адначасова з'яўляюцца і механізмам для трансфармацыі і развіцця сацыяльна-культурнай сферы, а не толькі выключна акадэмічнымі даследаваннямі.

Такім чынам, падсумоўваючы варта адзначыць наступнае. Праблема сучаснаці мае актуальнае значэнне для культуралогіі і даследаванняў культуры. Для культуралогіі, якая прызвычаілася

працаваць са статычнымі аб'ектамі, калі культура разглядаецца ў шырокай гістарычнай перспектыве і яе дынаміка расцягваецца на стагоддзі, дастаткова не проста перайсці да вывучэння сучаснасці, якая ўвесь час мяняецца. Разуменне бягучай ці дакладней цякучай сучаснасці (у адпаведнасці з метафарай З. Баўмана), непасрэдным чынам закранае пытанне культуры і таго, што да яе можа быць аднесена. Распаўсюджаныя ў грамадстве формы культурнай ідэнтычнасці залежаць ад вызначаных часовых рамак і не маюць ўніверсальнага характару, які б быў пазбаўлены часовага вымярэння. Шматлікія дынамічныя, але пры гэтым кароткатэрміновыя супольнасці да якіх належаць людзе, не могуць вырашыць глабальных, прынцыповых пытанняў у сферы культуры. Канструяванне культурнай ідэнтычнасці непазбежна выклікае неабходнасць выпрацоўкі адказаў на аксіялагічныя пытанні адносна разумення мінулага і ўяўлення праекта будучыні.

1. Бауман, З. Текучая современность / З. Бауман. – СПб. : Питер, 2008. – 240 с.
2. Гидденс, Э. Последствия современности / Э. Гидденс. – М. : Праксис, 2011. – 352 с.

## MODERNITY AS A PRSPECTIVE SPHERE OF CULTURAL RESEARCH

***Alexei Krivolap***
*Belarusian State University for Culture and Arts, Minsk, Belarus.*
*email2krivolap@gmail.com*

The article is devoted to the possibilities of researching the phenomenon of modernity within cultural studies. Especially in cases where it is necessary to outline the difference in approaches to the modernity of other socio-humanitarian disciplines. Concepts of modernity that were proposed at the turn of the XX and XXI centuries are considered. (Z. Bauman and A.Giddens). The article does not attempt to address all issues related to the problem of modernity, but rather is a comprehensive introduction to understanding the problem of modernity in the field of culture

***Keywords: modernity, modernization, cultural studies, media, praxis.***